Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
10 СНЕЖНЯ 2016 г. СУБОТА № 239 (28349)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Новы расклад руху цягнікоў**



**Як зарабіць на смецці?**

СТАР. 7




**Пачуць Багдановіча**

СТАР. 11

# «Я ХАЦЕЎ БЫ СПАТКАЦЦА З ВАМІ НА ВУЛІЦЫ...»

**Учора ў Беларусі быў Максімаў дзень. Да 125-годдзя Багдановіча па ўсёй краіне ладзіліся святочныя імпрэзы, чытанні, канферэнцыі. Побач з помнікам паэту, у сталічным скверы каля Вялікага тэатра оперы і балета, нягледзячы на надакучлівы дробны дождж, маладыя людзі, гэткія самыя маладыя і натхнёныя, якім і ён быў калісьці, чыталі яго вершы. Пра іншыя значныя мерапрыемствы, якія адбываліся ў сталіцы ў дзень юбілею Максіма Багдановіча, чытайце на стар. 2.**



Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Эла СЯЛІЦКАЯ, намеснік міністра па падатках і зборах:**

*«Змены, якія ўступяць у сілу з 1 студзеня 2017 года, не прыносяць ніякіх змен у колькасць падаткаў, не ўносяць істотных змяненняў у парадак іх вылічэння. Вырашэнне пытанняў накіравана на практычнае прымяненне падатковага заканадаўства плацельшчыкамі. Таму падатковая нагрузка на эканоміку застанецца на ўзроўні 2016 года».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 6° |
| Віцебск | 0° |
| Гомель | + 5° |
| Гродна | + 5° |
| Магілёў | + 3° |
| Мінск | + 4° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9739 | ▼ |
| Еўра | 2,0967 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0312 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0763 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X
16239>

■ Круглы стол

# ЯК ЗНАЙСЦІ РАБОТУ ПАСЛЯ 50?

## Трэба працаваць так, каб у табе былі зацікаўленыя

**Цэнтр маркетынгавых і сацыялагічных даследаванняў кадравага дома «СуперДжоб» у Расіі праводзіў апытанне. У 200 работадаўцаў пацікавіліся: «Які фактар больш, чым іншыя, уплывае на адмову пры працаўладкаванні людзей, старэйшых за 45 гадоў?». 22 працэнты назвалі «складанасці ў навучанні», на другім месцы (гэту прычыну ўпамянулі 19 працэнтаў) аказаўся «савецкі менталітэт». А 15,5 працэнта рэспандэнтаў адзначылі меншую працаздольнасць людзей пасля 45 гадоў.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Паводле статыстыкі, 27 працэнтаў беспрацоўных — людзі за 50. Пасля павышэння пенсійнага парогу, пытанне працаўладкавання гэтай катэгорыі становіцца яшчэ больш актуальным. А калі ўлічваць, што страхавы стаж, неабходны для атрымання выплат па ўзросце, за апошнія два гады вырас у тры разы, то для многіх ад таго, ці ёсць сёння работа, залежыць, ці будзе заўтра пенсія.**

СТАР. 4-5

■ Разумныя грошы

# МОЙ БАНК У «МАБІЛЕ»



**Са смартфона можна адкрываць рахункі і мяняць валюту без маржы**

**Беларускія распрацоўшчыкі выпусцілі фінансавы дадатак, які не паўтарае ні адну мабільную платформу ў свеце. Сярод асноўных адрозненняў — магчымасць адкрыць рахунак без наведвання аддзялення, купляць валюту са смартфона па спецкурсе, які заўсёды ніжэйшы за рыначны, а таксама ўнікальны інтэрфейс узаемадзеяння платформы з кліентам.**

## Нумар тэлефона плюс фота

Да апошняга часу галоўным нерэалізаваным пажаданнем спажыўцоў фінансавых паслуг была магчымасць адкрываць рахункі ў банках, седзячы дома. Гэты мабільны дадатак, які ўжо запусціў адзін з камерцыйных банкаў, вырашае гэтую праблему даволі проста. Цяпер для адкрыцця рахунку ў банку дастаткова зарэгістравацца на віртуальнай платформе з дапамогай смартфона. Для ажыццяўлення такой ідэнтыфікацыі трэба толькі паказаць нумар тэлефона, упісаць у адпаведную графу прозвішча, імя і імя па бацьку, а таксама прыкласці фота з пашпарта. Далей пластыкавая картка будзе дастаўлена кліенту кур'ерам. Наведваць банкаўскае аддзяленне і падпісваць дакументы больш не трэба: усе аперацыі можна выконваць у анлайн-рэжыме, а карыстацца дадаткам могуць усе жадаючыя, дзе б яны ні знаходзіліся.

СТАР. 7

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!